# УПЛЫЎ ПОГЛЯДАЎ БЕЛАРУСКІХ АСВЕТНІКАЎ XVI ст. НА РАЗВІЦЦЁ ПРАВА

***Д. С. Жук***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

У Прэамбуле да дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь запісана, што яна абапіраецца на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці. Гэта палажэнне Канстытуцыі абавязвае даследчыкаў усебакова і паслядоўна вывучаць гісторыка-прававое мінула беларускага народа, даследаваць пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, развіцця палітычных і прававых ідэй беларускіх асветнікаў.

У Беларусі ў XVI ст. вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі, прававедамі былі Францыск Скарына, Астафій Валовіч, Мікалай Радзівіл Чорны, Андрэй Волан, Леў Сапега, погляды якіх значна ўплывалі на развіццё права.

Знакаміты асветнік XVI ст. Ф. Скарына выказваў думкі наконт класіфікацыі права, мэты крымінальнага пакарання і заканадаўства. Закон у Ф. Скарыны выступае як падстава, на якой павінна грунтавацца сацыяльная гармонія, існаваць грамадства. Парушэнне законнасці, правасуддзя вядзе да разбурэння грамадскай згоды і адзінства. Каб гэтага пазбегнуць, неабходна сачыць і дабівацца, каб закон быў сумленным, справядлівым, працуючым, адпавядаючым прыродзе рэчаў, звычаям той зямлі, дзе ён ствараецца, часу, месцу. Ён павінен быць стылістычна бездакорным, дакладным і зразумелым, каб не было падставы да яго двухсэнсавага тлумачэння, і адпавядаць інтарэсам усяго грамадства.

Значную цікавасць уяўляюць погляды Ф. Скарыны на класіфікацыю права. На яго думку, права дзеліцца на натуральнае і пісанае.

Натуральнае права закладзена ў самой істоце чалавека і аднолькавае для ўсіх людзей, уласціва кожнаму чалавеку і не залежыць ад месца і часу. Яго сэнс у наступным: «тое чыніці іншым усім, што самому люба ёсць ад іншых усіх. І таго не чыніці іным, чаго сам ня хошчашы ад іных меці». Пісанае права Ф. Скарына падзяляў на боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Нормы боскага права змешчаны ў кнігах Старога і Новага Запавету і з'яўляюцца сінонімамі волі Бога.

Таму заслугоўвае асуджэння не толькі той, хто не падпарадкоўваецца волі Бога, але і той, хто не ведае яе прадпісанняў. Кананічнае права –гэта пастановы (каноны), прынятыя царкоўнай уладай.

Вялікі інтарэс выклікае земскае права, дзе Ф. Скарына вылучаў наступныя галіны права: паспалітае права (уключала ў сябе нормы грамадзянскага і сямейнага права), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае правы.

Прапанаваная ім класіфікацыя выкарыстана пры падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1529 г., а менавіта яго дзяленне земскага права на адпаведныя галіны права.

Выказваўся Ф. Скарына і аб мэце крымінальнага пакарання, сутнасць якой заключаецца, з аднаго боку, у застрашванні злачынцы, з другога – у папярэджанні іншых асоб, здольных здзейсніць злачынства. Трэба адзначыць, што яго трактоўка амаль што сугучная з сучаснай мэтай крымінальнай адказнасці, якая змяшчаецца ў ч. 2 арт. 44 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і гучыць наступным чынам:«…выпраўленне асобы, здзейсніўшай злачынства, і папярэджаннездзяйснення новых злачынстваў як асуджаным, так і іншымі асобамі».

На змест Статута ВКЛ 1566 г. паўплывалі погляды на дзяржаву і права А. Валовіча і М. Р. Чорнага. Па прапанове А. Валовіча ў Статут уключаны артыкул, які забараняў «чужаземцам», у першую чаргу феадалам Польшчы, набываць землі і займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ (раздз. III, арт. 4). А. Валовіч праводзіў палітыку свабоды веравызнання і абароны дзяржаўнага суверэнітэту ВКЛ, што праявілася і ў Статуце. Прававая і палітычная дзейнасць А. Волана засноўвалася на трох катэгорыях: свабодзе, роўнасці і справядлівасці, якія і сёння з’яўляюцца першапачатковымі накірункамі пры будаўніцтве дэмакратычных дзяржаў і развіцці іх прававых сістэм. Ён сцвярджаў, што права павінна быць справядлівым, выступаць гарантам свабоды і роўнасці, быць разумным. А. Волан адстойваў ідэю роўнасці перад законам прадстаўнікоў усіх саслоўяў і лічыў, што менавіта роўнасць людзей перад законам, яе ўвасабленне ў палітычным жыцці вызначаюць дасканаласць дзяржавы. Сугучнасць гэтай думцы можна знайсці ў Статуце ВКЛ 1588 г. (раздз. I, арт. 1).

Ідэю прававой свабоды выказаў прадаўжальнік скарынінскіх традыцый Л. І. Сапега. У прадмовах да Статута 1588 г. ім была сфармулявана канцэпцыя прававой дзяржавы. На думку Л. Сапегі, сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя правы чалавека – уласнасці і асабістай недатыкальнасці. Менавіта для абароны грамадзянскіх свабод і існуе права, якое Л. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека, «вартавога ўсеагульнай свабоды». Права павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё грамадства. Закон, на яго думку, павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх станаў і яго павінны ўсе паважаць, інакш будзе панаваць беззаконне. Права стрымлівае людзей ад злачынстваў.

Аснова ўстойлівасці, стабільнасці ўсякага грамадства, дзяржавы – прававая абароненасць чалавека. Толькі там, дзе вяршэнствуе права, захоўваецца годнасць, бяспека, маёмасць і наогул свабода чалавека. Ідэі Л. Сапегі знайшлі адлюстраванне ў нормах Статута ВКЛ 1588 г.

Увогуле ідэі, думкі беларускіх асветнікаў XVI ст. і на сённяшні дзень застаюцца актуальнымі і запатрабаванымі сучаснай прававой навукай.